# Музейны занятак
# “Вайна… Памятаць – цяжка, забыць – не можам…”

**С. М. Зяцькова,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі,
Гарбавіцкага ВПК дзіцячы сад–сярэдняя школа
Чавускага раёна

Усё далей адыходзяць падзеі, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, і ўсё меней тых, хто ведае аб тым, якой цаной была здабыта перамога над фашысцка-нямецкімі захопнікамі. Для таго каб дзеці ўсвядомілі і адчулі важнасць і трагедыю тых доўгіх дзён Вялікай Айчыннай вайны, атрымалі эмацыянальны водгук у сваіх сэрцах, адчулі пачуццё гонару за свой народ і надоўга захавалі ў памяці тыя падзеі, неабходна выкарыстоўваць розныя метады і формы работы. Адной з такіх форм, на маю думку, з'яўляецца музейны занятак. Ён адрозніваецца ад звычайнага ўрока тым, што асноўнай крыніцай новай інфармацыі для навучэнцаў з'яўляецца не толькі аповед настаўніка, але і сапраўдныя помнікі гісторыі – музейныя экспанаты.

Актуальнасць тэмы дадзенага музейнага занятку заключаецца ў тым, што адным з прыярытэтных напрамкаў выхаваўчай сістэмы ў сучасных адукацыйных установах з'яўляецца патрыятычнае выхаванне. А пачынаць трэба перш за ўсё з выхавання любові да малой радзімы, павагі да яе герояў, з чаго потым і вырасце гонар за сваю краіну, любоў і павага да свайго народа, яго гісторыі, мовы.

*Мэта:* пашырэнне ведаў навучэнцаў пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гадоў праз выкарыстанне матэрыялаў экспазіцыі школьнага гісторыка-краязнаўчага музея, прысвечанай падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

*Задачы:*

- развіваць пазнавальную актыўнасць вучняў, спрыяць пашырэнню ведаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гг.;

- спрыяць успрыманню музейных прадметаў ваеннай экспазіцыі як крыніц інфармацыі пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гг.;

- садзейнічаць фарміраванню грамадзянскіх і патрыятычных якасцей асобы вучняў, пачуцця любові і павагі да гісторыі і людзей, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.

*Форма правядзення музейнага занятку:* літаратурна-музычная кампазіцыя.

*Абсталяванне:* музейныя экспанаты, ноўтбук, аўдыязапісы ваенных песень, чамадан.

*Узроставая аўдыторыя:* навучэнцы 6-7 класаў (11-13 гадоў).

*Працягласць занятку:* 45 хвілін.

## ХОД МЕРАПРЫЕМСТВА

*Гучыць аўдыязапіс песні“Свяшчэнная вайна”.*

*Мелодыя становіцца цішэй, і на яе фоне навучэнцы чытаюць тэкст.*

***1-ы:*** Вставай, страна огромная, вставай на смертный бой!

***2-і:*** С фашистской силой тёмною, с проклятою ордой!

***3-і:*** Пусть ярость благородная вскипает, как волна!

***4-ы:*** Идёт война народная, священная война.

***5-ы:*** Гэта словы вядомай песні “Свяшчэнная вайна”. Яны прагучалі для ўсіх жыхароў Савецкага Саюза як заклік адстаяць незалежнасць роднай краіны. Вайна, як чорная хмара, накрыла вялікую тэрыторыю нашай Радзімы. Не абышла яна і нашы родныя Гарбавічы.

***6-ы:*** Пра падзеі тых гадоў мы цяпер даведваемся з кніг, кінастужак і, бяспрэчна, прыходзячы сюды, у школьны музей.

***7-ы:*** Кніга ваеннага летапісу вельмі вялікая, але сёння мы хочам перад вамі разгарнуць толькі сем яе старонак. Гэта сем экспанатаў нашага музея, якія звязаны з падзеямі самай жахлівай і доўгай вайны.

*Гучыць аўдыязапіс песні”О героях былых времён”.*

***1-ы:*** Куды б ні ішоў, ні ехаў ты, але тут спыніся.

Магіле гэтай, дарагой, усім сэрцам пакланіся.

*(Падыходзіць і дастае з чамадана сшытак (ДАДАТАК А)).*

На вясковых могілках аграгарадка Гарбавічы ёсць магіла лётчыцы Ніны Залатаровай. Гэта адважная дзяўчына, камсамолка, родам з рускага горада Есентукі, удзельнічала ў складзе 230-ай Кубанскай авіядывізіі ў баях за вызваленне нашай роднай вёскі. У 1942 годзе Ніна атрымала ваенную спецыяльнасць – паветраны стралок. Лятала ў экіпажы самалёта ІЛ-2 пад кіраўніцтвам камандзіра П. І. Лапава 25 чэрвеня 1944 года самалёт быў збіты. Цяжка параненую лётчыцу закатавалі немцы і паліцаі. Пахавалі Залатарову жыхары на мясцовых могілках.

Вось гэты сшытак *(трымае ў руках сшытак і паказвае яго)* па прыборах авіянавігацыі быў падараваны школьнаму музею маці лётчыцы, Таццянай Аляксандраўнай, якая прыязджала на магілу сваёй дачкі пасля заканчэння вайны.

*Гучыць аўдыязапіс песні “В землянке”.*

***2-і:*** Такие маленькие хрупкие листочки –

Листовки, как военные призы,

Источник радости и фактов точных –

Носили к мужеству и стойкости призыв.

*(Падыходзіць і дастае з чамадана лістоўку (ДАДАТАК Б)).*

Каштоўным экспанатам нашага музея з’яўляецца лістоўка “За Радзіму”, выдадзеная 1 студзеня 1944 года да 25-годдзя з дня ўтварэння БССР. Выпускам кіраваў Магілёўскі падпольны абкам КП(б). Лістоўка была прызначана для

інфармавання насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. У ёй змяшчаліся звесткі пра паспяховае наступленне Чырвонай Арміі.

*Гучыць аўдыязапіс песні" Шёл солдат".*

***3-і:*** В покоя час полночной тишины
Солдатам бывшим и в миру не спалось –
Осколками зловещими войны
Тела их изрешечены немало.

*(Падыходзіць і дастае з чамадана даведку (ДАДАТАК В)).*

Жывым, цяжкапараненым, можна сказаць, інвалідам, вярнуўся з вайны наш зямляк – Афанасій Нікіціч Зайцаў. У музеі захоўваецца дакумент часоў Вялікай Айчыннай вайны – даведка аб яго раненні. Выдадзена яна 13 жніўня 1944 года. Падпісана Пастуховым, начальнікам шпіталя, маёрам медслужбы.

Афанасій Нікіціч служыў ў 238-й Карачаеўскай дывізіі. Удзельнічаў у абароне Масквы, баях за Сталінград. Узнагароджаны медалямі "За абарону Масквы", "За перамогу над Германіяй", "За адвагу", ардэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны I ступені. Прыйшлося таксама Афанасію Нікіцічу вызваляць і сваю родную вёску Гарбавічы.

*Гучыць аўдыязапіс песні "Майскі вальс".*

***4-ы:*** Вясна сорак пятага года прынесла доўгачаканую Перамогу. Байцы Чырвонай Арміі, былыя хлебаробы, рабочыя, настаўнікі, пачалі вяртацца дадому, да мірнага жыцця.

***5-ы:*** Да, им досталась дорогой ценой
Победа, дорогого она стоит.
И многие с наградами домой
Вернулись, чтобы заново мир строить.

*(5 і 6 навучэнцы падыходзяць і дастаюць з чамадана па чарзе падзяку (ДАДАТАК Г ) і медалі з пасведчаннямі (ДАДАТАК Д )).*

***4-ы:*** У музеі захоўваецца падзяка, якую ўручылі нашаму былому настаўніку, ветэрану вайны Фёдару Фёдаравічу Кунтышу. Дакумент гэты выдадзены летам 1945 года і падпісаны маршалам Савецкага Саюза І.Коневым.

***5-ы:*** А яшчэ ў нас захоўваюцца баявыя ўзнагароды Фёдара Фёдаравіча і пасведчанні да іх. Медаль “За вызваленне Прагі” і медаль “За ўзяцце Берліна”.

***6-ы:*** Цікавай, унікальнай рэччу з’яўляецца дарожны чамадан ветэрана вайны Раманава Уладзіміра Раманавіча.

*(Падыходзіць і паказвае чамадан (ДАДАТАК Е)).*

Экспанат цікаўны тым, што фактычна гэта скрыня для снарадаў, але яна была выкарыстана як чамадан для асабістых рэчаў. На ім захаваліся наклееныя ўнутры як рускія, так і нямецкія паштоўкі.

*Гучыць аўдыязапіс песні “День Победы”.*

***7-ы:*** Мир пришёл всем бедам вопреки.
Расцвели победные знамёна.
Благодарны вечно земляки
И живым, и, безусловно, мёртвым.

*(Падыходзіць і дастае з чамадана кнігу (ДАДАТАК Ё)).*

Мабыць, самым унікальным экспанатам музея з’яўляецца кніга пісьменніка Канстанціна Сіманава – раман “Живые и мёртвые” ў трох тамах з дароўным надпісам школьнаму музею. Яна была падаравана аўтарам 27 ліпеня 1974 года. Навучэнцы Гарбавіцкай школы пад кіраўніцтвам настаўнікаў Кузьмянкова П.М., Судзянковай Г.І., Шундалава Т.В. неаднаразова хадзілі ў паходы па месцах баёў 61-га стралковага корпуса ў 1941 годзе. Былі знойдзены каштоўныя матэрыялы аб выхадзе з акружэння байцоў і камандзіраў корпуса. Устаноўлена месца гібелі камісара Воранава І.В. Лісты, знойдзеныя ўдзельнікамі пошукавых экспедыцый, былі адпраўлены ў Маскву пісьменніку Канстанціну Сіманаву. І ён у 1974 годзе наведаў наш школьны музей.

***1-ы:*** Война… Забыть её не смеем
И через год, и через век!

***2-і:*** Мы просто права не имеем,
Коль носим имя – человек!

***3-і:*** Сейчас мир добротой украшен,
И птицы гнёзда стали вить.

***4-ы:*** Война живёт в музее нашем

И ещё долго будет жить.

***5-ы:*** Пусть только через экспонаты

Музейной хрупкой старины

***6-ы:*** Мы вспомним горький путь солдата,

Изведавшего боль войны.

***7-ы:*** Война… Забыть её не смеем

И через год, и через век!

Мы просто права не имеем,

Коль носим имя – Человек!

**Рэфлексія**

*Пасля заканчэння музейнага занятку з навучэнцамі праводзіцца рэфлексія.*

Кожнаму вучню раздаецца эмблема ў выглядзе зоркі, на адваротным баку якой напісаны пытанні:

1) Што запомнілася?

2) Што спадабалася?

3) Пра што раскажаце сваім бацькам і сябрам?

4) Ці прыйдзеце яшчэ на заняткі ў школьны музей?

5) Ці лічыце вы, што музейны занятак прайшоў для вас з карысцю?

ДАДАТАК А

**Экспанат 1**

Сшытак па прыборах авіянавігацыі лётчыцы Ніны Аляксандраўны Залатаровай.





ДФ № 175 ЧШМГ захаванасць частковая, тэкст месцамі дрэнна чытаецца. Сшытак складаецца з двух асобных рукапісаў.

**Экспанат 2**

Лістоўка 1944 года “За Радзіму”



ЗА РАДЗІМУ

НАША РОДНАЯ БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ СВАБОДНАЙ, САВЕЦКАЙ!

25 год БССР

За граніцай

АФ № 293 ЧШМГ захаванасць няпоўная, адарваны верхні правы вугал.

ДАДАТАК В

**Экспанат 3**

Даведка аб раненні ветэрана вайны, ураджэнца в. Гарбавічы Афанасія Нікіціча Зайцава.



СПРАВКА

В боях за Советскую Родину

тов.

был тяжело ранен

Нач. э/госпиталя

майор медслужбы (ПАСТУХОВ)

ДФ № 174 ЧШМГ захаванасць няпоўная, наклеена на паперу.

ДАДАТАК Г

**Экспанат 4**

Падзяка ветэрану вайны, быломy настаўніку Гарбавіцкай школы Кунтышу Фёдару Фёдаравічу.



ПЕРВЫЙ УКРАИНСКИЙ ФРОНТ

Благодарственная

ГРАМОТА

Кунтыш Ф.Ф.

ДФ № 79 ЧШМГ захаванасць няпоўная, парваныя краі, папера пажоўкла.

**Экспанат 5**

Медалі “За вызваленне Прагі”, “За ўзяцце Берліна” ветэрана вайны, былога настаўніка Гарбавіцкай школы Кунтыша Фёдара Фёдаравіча.



Медаль “За вызваленне Прагі” – АФ № 117 ЧШМГ захаванасць здавальняючая, пацямненне з двух бакоў.

Медаль “За ўзяцце Берліна” – АФ № 118 ЧШМГ захаванасць здавальняючая, пацямненне з двух бакоў.

**Экспанат 6**

Дарожны чамадан ветэрана вайны Раманава Уладзіміра Раманавіча.






ДФ № 118 ЧШМГ захаванасць частковая, паштоўкі пажоўклі.

ДАДАТАК Ё

**Экспанат 7**

Кніга К. Сіманава “Живые и мёртвые” ў трох тамах з дароўным надпісам школьнаму музею: “Педагогам и учащимся Горбовичской средней школы на добрую память с глубокой благодарностью за  помощь в поисках людей, о которых написана эта книга”.




Том 1 – АФ № 89 ЧШМГ захаванасць няпоўная, склеена скотчам. Забруджанасць аркуша з  дароўным надпісам.

Том 2 – АФ № 90 ЧШМГ захаванасць поўная.

Том 3 – АФ № 91 ЧШМГ захаванасць поўная.